Литература:
1.Матурана У.Р. Варела Ф.Х. Древо познания. Биологические корни человеческого понимания.-М. 2001. / Цит. по: Философия науки: хрестоматия. – М., 2005. – С.90.
2.Микешина Л.А. Философия науки: учебное пособие. – М.2005.
3.Рассел Б. Человеческое познание, его сфера и границы. – Киев, 2001.
4.Там же.

**Резюме**

Данная статья посвящена проблеме интерпретации как одной из актуальных проблем современной эпистемологии. Интерпретация рассматривается в качестве необходимого условия развития науки.

**Summary**

This article deals with the one of the actual problems of modern epistemology – the problem of interpretation. Interpretation is researched as necessery condition of science's development.

УДК 947. 6 “1588-1668”

# ПАСОЛЬСКАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ АД ПОЛАЦКАГА ВАЯВОДСТВА НА СОЙМАХ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У 1588-1668 ГГ.

**Галубовіч В.У.**

УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Даследаванне прадстаўніцтва асобных адміністрацыйных адзінак Вялікага Княства Літоўскага на соймах Рэчы Паспалітай яшчэ толькі пачынае разгортвацца ў айчыннай гістарыяграфіі. Польскія даследчыкі, якія шмат зрабілі для вывучэння гісторыя парламентарызма ў Рэчы Паспалітай, не надавалі ўвагі рэгіянальнаму падыходу пры вывучэнні прадстаўніцтва ад ВКЛ. Дадзены артыкул з'яўляецца спробай запаўнення прабелу ў гістарыяграфіі адносна ўдзелу ўскраінных паветаў ВКЛ у палітычным жыцці шляхецкай рэспублікі часоў праўлення каралёў дынастыі Вазаў.

Працэдура абрання і выправы паслоў на соймы Рэчы Паспалітай ад Полацкага ваяводства была юрыдычна ўрэгулявана і адбывалася ў адпаведнасці з нормамі Статута ВКЛ 1588 г. Згодан з трэцім артыкулам трэцяга раздзела Статута полацкім паслам вызначаліся "*пернези стравные*" у памеры ста шасцідзесяці коп грошаў літоўскіх, а калі "*з допущенья была божьего дорогость збожъя и иное живности*", то сума магла ўзрасці "*водлуг уваженья часу и далекости дороги*" [4, с. 116]. Зразумела, што напрацягу наступных 80-ці гадоў кошты ўтрымання паслоў раслі, тым не менш, вызначаная сума ў цэлым была

дастатковай для побыту ў Варшаве, прынамсі, да сярэдзіны двадцатых гадоў XVII ст. [14, s. 600]. Асобна варта адзначыць, што выкананне пасольскіх функцый было прывабным з матэрыяльнага пункту гледжання, як шанец на пэўнае ўзбагачэнне [14, s. 606].

Дадзеныя пра паслоў ад Полацкага ваяводства захаваліся, у першую чаргу, у інструкцыях, якія складаліся для прадстаўнікоў лакальнай шляхецкай грамады на перадсоймавых сойміках. Такія звесткі ёсць і ў соймавых дыярыюшах. Пераважна на аснове гэтых крыніц польскімі гісторыкамі былі высветлены імёны полацкіх шляхціцаў, якія выбіраліся ці ўдзельнічалі ў працы соймаў у час праўлення Уладзіслава і Яна Казіміра Вазаў. На жаль, не сістэматызаваныя адпаведныя дадзеныя пра полацкіх паслоў за час працяглага праўленнем Жыгімонта Вазы.

Полацкія перадсоймавыя соймікі адбываліся ў 1588-1654 гг. рэгулярна і вызначалі асоб з ліку мясцовых абывацелей для ўдзелу у працы парламента. У час вайны 1654-1667 гг. полацкая шляхта таксама выбірала сваіх прадстаўнікоў для працы соймаў. Наяўныя архіўныя і апублікаваныя крыніцы не фіксуюць канфліктныя сітуацыі ў сувязі з абраннем соймавай рэпрэзентацыі ад ваяводства.

Інфармацыя пра паслоў ад Полацкага ваяводства сістэматызавалася намі па перыядах праўлення трох каралёў дынастыі Ваза. Спецыяльна не ўлічваліся паслы, якія абіраліся на канвакацыйныя і элекцыйныя соймы.

Найбольш супярэчлівая інфармацыя пра паслоў ад ВКЛ паходзіць з часоў праўлення Жыгімонта Вазы (1588-1632 гг.). Абумоўлена гэта вялікай колькасцю соймаў – 37 за 44 гады праўлення. Сістэматызаваныя дадзеныя пра паслоў ад Полацкае ваяводства за гэты час адсутнічаюць. Найменш інфармацыі пра паслоў абраных на соймы ў канцы XVIст.: па звестках беларускага даследчыка У. Падалінскага, вядомы паслы на сойм 1589 г. (Міхал Сакалінскі і Васіль Рэвут), 1596 г. (Яраш Корсак), 1597 г. (Рыгор Сямашка) [8]. У 1600 г. пасламі былі Ян Корсак-Галубіцкі і Аляксандр Цішкевіч [13, s. 100]. У XVII ст. пасламі на некалькіх соймах выбіраліся вядомыя на Полаччыне шляхціцы Аляксандр Тышкевіч у 1607 г. [5, s. 190] і 1611 г. [6, s. 49], Ян Корсак-Галубіцкі ў 1609 г.[3, с. 1], 1613 г. [16, s. 111, 117], 1615 г. [16, s. 111, 117], Даніэль Шчыт-Забельскі 1607 г. [5, s. 190], 1623 г. [7, s. 254]. Да выключэнняў агульнадзяржаўнага характару належыць аднесці той цікавы факт, што ў 1611 г. і 1615 г. полацкім паслом быў сенатар – парнаўскі кашталян, якому аўтаматычна было гарантавана месца ў сенаце [15, s. 126].



РЕПОЗИТОРИЙ ПГУ

Звесткі пра паслоў ад Полацкага ваяводства ў час праўлення Уладзіслава Вазы (1633-1448 гг.) маюцца ў працах польскіх гісторыкаў С. Холдыс і Я. Дзенгелеўскага [9, 10]. Аднак, інфармацыя пра абраных менавіта на полацкім сойміку паслоў змяшчана толькі ў даследаванні С. Холдыс. Паводле яе дадзеных, полацкімі пасламі былі Міхал Корсак (1633 г.), Андрэй Дунін-Канінскі (1638 г.), Ян Казімір Пац (першы сойм 1635 г., 1640 г., 1646 г.), Юзаф Кланоўскі (першы сойм 1637 г., 1641 г., 1646 г.), Пётр Казімір Беганьскі (1640 г.), Ян Падбіпента (1641 г.). Дадаць можна, што ў інструкцыі полацкай шляхты на каранацыйны сойм 1633 г. як пасол згадваецца А. Дунін-Канінскі [2, с. 13]. Аўтар манаграфіі, прысвечанай першаму сойму 1637 г., Р. Каладзей, удакладніў, што ад Полацкага ваяводства выбраныя былі Марцыян Гедройць, віленскі падсудак і Ян Казімір Пац, але яны не прысутнічалі на нарадах [11, s. 270]. Калі пагадзіцца са звесткамі Р. Каладзея, дык прыйдзецца прызнаць памылкай тое, што на першым сойме 1637 г. Полацкае ваяводства рэпрэзентаваў Ю. Кланоўскі, як вынікае з працы С. Холдыс. Акрамя вышэйпададзеных, ***напэўна*** полацкім паслом на першым сойме 1635 г. быў Даніэль Шчыт, падсудак полацкі; на сойме 1638 г. – Ян Падбіпента, пісар земскі полацкі; ***магчыма***, у 1645 г. – Ян Лісоўскі, падваявода полацкі, а на першым сойме 1635 г., у 1638 г. і 1642 г. – Юзаф Кланоўскі [9, s. 169, 171, 175, 179]. Трэба таксама адзначыць, што паводле спісаў, складзеных Р. Каладзеям і Я. Дзенгелеўскім паслом на першы сойме 1637 г. быў і Абрам Зяновіч, полацкі падстолі, які рэпрэзентаваў нейкі іншы павет [11, s. 272; 9, s. 183].

З 15-ці соймаў, якія адбыліся за час праўлення Уладзіслава Вазы, поўны камплект паслоў вядомы на 6 соймах, для астатніх 8 дакладнай інфармацыі бракуе. Найбольшую колькасць пасольскіх мандатаў ад Полацкага ваяводства ў гэты час атрымалі Я.К. Пац і Ю. Кланоўскі. Цяжка сказаць пра астатніх, але Ю. Кланоўскі і П. Беганьскі безумоўна належалі да пракаралеўскай партыі.

Перыпетыі праўлення Яна Казіміра Вазы (1649-1668 гг.) паўплывалі і на парадак правядзення перадсоймавых соймікаў і абранне павятовых паслоў. Ва ўмовах акупацыі Полацкага ваяводства соймікі збіраліся з 1654 г. там, дзе вызначалі самі шляхціцы, з 1658 г. такім месцам быў Кобрын, а з 1661 г. – Мядзель [15, s. 82]. Зразумела, што полацкія шляхціцы, якія прынялі маскоўскае падданства, не маглі прэтэндаваць на ўдзел у працы сойміка. З капітальнай працы С. Охман-Станішэўскай і З. Станішэўскага, прысвечанай соймам перыяду праўлення Яна Казіміра, вядома пра 299 паслоў ад Вялікага Княства Літоўскага, а разам з неідэнтыфікаванымі – 303 [12, s. 383-399]. Павод-

РЭПАЗІТОРЫЙ ПГУ

ле дадзеных С. Охман-Станішэўскай і З. Станішэўскага прадстаўнікамі полацкай шляхты на соймах былі N. Дзевялтоўскі (абіраўся і ўдзельнічаў у двух соймах 1654 г.), Ян Корсак, падчашы полацкі (абіраўся паслом у 1655 г., 1658 г., 1661 г., 1662 г., аднак, пацверджаны яго ўдзел толькі ў працы сойма 1658 г.), Ян Уладзіслаў Корсак, падкаморы полацкі (быў паслом на сойме 1659 г.), Ян Падбіпента, падсудак полацкі (быў на сойме 1649 г., 1653 г., 1654 г. (II), 1661 г., 1662 г., 1665 г., 1666 г. (I), 1667 г.), Юстыніян Шчыт-Неміравіч (прадстаўляў ваяводства ў 1667 г. і ў якасці ўжо полацкага віцэваяводы – на другім сойме 1668 г.), Мікалай Неміравіч Шчыт (удзельнічаў у працы сойма 1661 г.), Канстанцін Жыгімонт Пац, надворны харужы ВКЛ (удзельнічаў у другім сойме 1668 г.). Да гэтага пераліку трэба дадаць неідэнтыфікаванага польскімі даследчыкамі полацкага земскага суддзю – удзельніка першага сойма 1654 г., якім з'яўляўся Міхал Тышкевіч [1, с. 76]. Вельмі верагодна, што паслом ад полацкай шляхты ў 1653 г. мог быць Пётр Казімір Беганьскі, полацкі падкаморы, парламентарыст яшчэ з часоў Уладзіслава Вазы. На жаль, нельга дакладна сказаць, які павет накіраваў на сойм 1649 г. Стэфана Рыпінскага, гараднічага полацкага, а ў 1649/1650 гг. – Міхала Невельскага, полацкага лоўчага, паколькі полацкія шляхціцы маглі прадстаўляць і не свой павет. Так, полацкі стольнік Станіслаў Мельхіёр Савіцкі быў абраны паслом на мельніцкім сойміке, г. зн., у Кароне Польскай [12, s. 395]. Аднак, не вядома ці займаў С.М. Савіцкі пазначаную пасаду ў 1649 г. [1 ,с. 78-79].

Сярод полацкіх паслоў безумоўным рэкардыстам па колькасці ўдзелаў у працы соймаў з'яўляецца Ян Падбіпента. Зафіксаваныя восем выпадкаў абрання яго прадстаўніком Полацкага ваяводства, а гэта не на многа менш чым у прадстаўніка ВКЛ і безумоўнага лідэра па колькасці разоў выкарыстання (пацверджана 15 выпадкаў) пасольскіх мандатаў па ўсёй Рэчы Паспалітай – Яна Антонія Храпавіцкага, але апошні прадстаўляў розныя паветы [12, s. 302].

Пералік прозвішчаў вядомых паслоў ад Полацкага ваяводства даказвае, што шляхта ў час праўлення Яна Казіміра традыцыйна арыентавалася на прадстаўнікоў мясцовай эліты і ў першую чаргу – павятовых ураднікаў. З ліку паслоў за толькі адзін належаў да магнацкага рода – К.Ж. Пац.

За час праўлення Яна Казіміра Вазы было прызначана 20 соймаў (у тым ліку 7 былі сарваныя). Камплект паслоў – па два маецца для 5 соймаў, па адным для – 7 і ніякіх звестак няма пра полацкіх паслоў на соймы 1649/50 гг., 1650 г., першы і другі соймы 1652 г., 1664/1665 гг., другі сойм 1666 г. і першы 1668 г. Полацкая шляхта, паводле права,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

выбірала на соймы два пасла, за выключэннем міжкаралеўяў, але паводле С. Охман-Станішэўскай і З. Станішэўскага, на сойм 1661 г. былі тры пасла, што праўда толькі два – Я. Падбіпента і М. Неміравіч Шчыт – сапраўды ўдзельнічылі ў ім.

Праведзены аналіз дазваляе зрабіць некаторыя заўвагі. Пасольская рэпрэзентацыя ад Полацкага ваяводства на соймах Рэчы Паспалітая фармавалася пераважна з ліку найбольш аўтарытэтных і адукаваных шляхціцаў, і ў значнай ступені складалася з павятовых ураднікаў. Рэдкасцю быў выбар цэнтральных ураднікаў і прадстаўнікоў магнацкіх родаў. Выбраннікаў гэтага памежнага ваяводства нельга лічыць знакамітых парламентарыстаў, аднак, некаторыя з іх, без сумненняў, добра арыентаваліся ў палітычных справах, пра што сведчыць колькасць выпадкаў выконвання пасольскіх функцый.

Спасылкі:


1. Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. *Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI- першая палова XVII стст.)* // Commetarii polocenses historici.– 2004.– T.I.– C. 73-80.
2. Российская Национальная Библиотека в Санкт-Петербурге. Отдел рукописей. Автографы Дубровского № 132, С. 13-16.
3. Научно-исследовательскbq архив Института истории РАН в Санкт-Петербурге. Русская секция архива. Коллекция № 13. Музей Русского Археологического общества. Воп. 1, картон 3, № 300. – *Дакумант адшукаў Андрэй Радаман.*
4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент.–Мн., 1989.– 573 с.
5. Biblioteka PAU i PAN w Krakowie. Rks. 360.
6. Biblioteka PAU i PAN w Krakowie. Rks. 365.
7. Byliński J. Dwa sejmy z roku 1613. / Acta Universitatis Wratislaviensis. № 689. Prawo. T.CXVII.– Wroclaw, 1984.
8. Codex diplomaticus Regni Poloniae et Magni Ducatzs Lituaniae. T. 1.– Vilnae, 1758. S. 239;
9. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie, Archiwum Radziwiłłów, dział II, t. 3, sygnatura № 348a; Dyaryusze sejmowe roku 1597.– Kraków, 1907. S. 422.
10. Dzięgielewski J. Izba poselska w systemie władzy Rzeczypospolitej w czasach Władysława IV.– Warszawa, 1992.
11. Hołdys S. Praktyka parlamenterna za panowania Władysława IV Wazy.– Wrocław, 1991. Kołodziej R. Pierwszy sejm z 1637 roku.– Toruń, 2003.
12. Ochmann-Staniszewska S., Staniszewski Z. Sejm Rzeczypospolitej za panowania Jana Kazimierza Wazy. Prawo-doktryna-praktyka. T.II.– Wrocław, 2000.
13. Radaman A., Ferenc M. Rejestr senatorów i posłów na sejmie walnym warszawskim 9 lutego - 21 marca 1600r. // Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Jagiellońskiego. Prace Historyczne. Z. 131.– 2004.– S. 89-107.
14. Rachuba A. Diety poselskie w Wielkim Księstwie Litewskim XVI-XVII wieku na przykładzie sejmiku żmudzkiego // Z dziejów kultury prawnej. Studia ofiarowane Profesorowi Juliuszowi Bardachowi w dziewięćdiesięciolecie urodzin.– Warszawa.– S. 599-606.
15. Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569-1763.– Warszawa, 2002.
16. Seredyka J. Posłowie wybrani na sejmy w latach 1611–1623 // Zeszyty Naukowe WSP w Opolu. Historia XXX.– Opole, 1994.– S. 97-134.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

**Резюме**

В исследовании проведён анализ депутатского представительства на сеймах Речи Посполитой от Полоцкого воеводства во время правления королей династии Ваза. Сделан вывод о преимущественном избрании депутатами от Полоцкого воеводства представителей местных знатных родов, что было общепринято в ВКЛ.

Ключевые слова: сейм, депутат, представительство, шляхта, Великое Княжество Литовское, Речь Посполитая.

**Summary**

The article is dedicated to the investigation of deputy representation of Polotsk province at Seims in Grand Duchy of Lithuania in the reign of the Vaza hous. The conclusion about primery election of representatives ot the local noble families and district officials as Polotsk province deputies is made. It was traditional in GDL.

Key words: Seim, deputy, representation, gentry, Grand Duchy of Lithuania, the Polish-Lithuanian Commonwealth

УДК 947.6. “1944–1946”

# ДА ПЫТАННЯ АБ УЗАЕМААДНОСІНАХ ПАМІЖ АНТЫСАВЕЦКІМІ ФАРМІРАВАННЯМІ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР У 1944–1946 ГГ.

**Рыбак Н.А.**

УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”
г.Гродно, Республика Беларусь

Адным з мала даследаванных пытанняў сучаснай айчыннай гісторыяграфіі з’яўляецца праблема існавання ў заходніх абласцях БССР у пасляваенны перыяд антысавецкага падполля (беларускага, украінскага, польскага і літоўскага). Узаемаадносіны паміж гэтымі фарміраваннямі ўвогуле засталіся па-за ўвагай беларускіх даследчыкаў. Між тым трэба адзначыць, што ўсе гэтыя структуры, змагаючыся за свае незалежныя дзяржавы, бачылі ў іх складзе беларускія землі. Літоўскае падполле, якое дзейнічала ў паўночна-заходніх раёнах БССР, імкнулася да аднаўлення Літоўскай рэспублікі ў даваенных межах. Украінскае падполле, прадстаўленае Арганізацыяй украінскіх нацыяналістаў (АУН) і яе ўзброеннымі сіламі – Украінскай паўстанніцкай арміяй (УПА), вяло барацьбу за стварэнне Украінскай незалежнай дзяржавы і актыўна дзейнічала на поўдні рэспублікі. Тэрыторыя Беларусі стала таксама арэнай дзеяння польскага падполля



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ